# Метадычны каментарый да вучэбнага дапаможніка “Музыка”

**I КЛАС**

Вучэбны дапаможнік “Музыка” для I класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі распрацаваны ў адпаведнасці з вучэбнай праграмай, зацверджанай Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь у 2015 г. Вучэбным дапаможнікам прадугледжана ўключэнне вучняў у разнастайныя віды мастацкай дзейнасці:

- слуханне;
- спевы;
- ігра на музычных інструментах;
- пластычнае інтанаванне;
- стварэнне музыкі;
- імправізацыя і інш.

Увесь вучэбны матэрыял у дапаможніку для I класа прадстаўлены ў выглядзе малюнкаў, па два развароты на ўрок (за выключэннем абагульняючых урокаў у канцы кожнай чвэрці — гэтым урокам адведзена па адным развароце дапаможніка). Арыентавацца ў відах дзейнасці дапамагаюць умоўныя абазначэнні (“Спяваем”, “Слухаем”, “Іграем пры дапамозе гучальных жэстаў”, “Іграем на інструментах”, “Пазнаём новае, разважаем”, “Прыдумваем і эксперыментуем”). Тэкст заданняў у дапаможніку не прыводзіцца. Таму прапануем яго настаўнікам на старонках часопіса “Пачатковая школа”.

Па кожнай тэме матэрыялу даецца крыху больш, чым патрабуецца на ўроку, і выкананне ўсіх заданняў, прадстаўленых у дапаможніку, не з’яўляецца абавязковым. Гэта зроблена дзеля таго, каб у настаўніка было права самастойна планаваць урок, адбіраць заданні зыходзячы з асаблівасцей агульнага і музычнага развіцця пэўнага класа.

**II чвэрць**

**ЯК РАСКАЗВАЕ МУЗЫКА?**

**Урок 9**

***Што і як можна расказаць пры дапамозе гукаў?***

**С. 34—35:**

Паслухайце твор кампазітара Роберта Шумана “Вясёлы селянін, які вяртаецца з працы”. Якім вам уявіўся селянін? Які стан яго душы? Якой паходкай ён ідзе? Якая з карцін больш за ўсё падыходзіць да характару музыкі? Разгледзьце іншыя карціны, на якіх сяляне ідуць дадому. Якія пачуцці людзей перададзены мастакамі на гэтых карцінах? Якая музыка змагла б перадаць іх стан?

**С. 36—37:**

Разгледзьце малюнкі. Раскажыце, што значыць сябраваць. Чаму людзі сябруюць? Паслухайце “Песеньку сяброў” (словы Я. Акіма, музыка В. Герчык). Якая гэта песенька па настроі? Развучыце песню, навучыцеся выразна яе выконваць. Падбярыце да песні гучальныя жэсты. Дапоўніце прыпеў ігрой на музычных інструментах.



**Урок 10**

***Гукаперайманне***

**С. 38:**

Паслухайце фартэпіянную п’есу Іраіды Каранеўскай “Дожджык”. Што імітавалі гукі фартэпіяна? Дождж быў аднолькавы ўвесь час? Які быў дожджык у пачатку (сярэдзіне, канцы) п’есы?

Стварыце гукавую карціну дажджу. Адлюструйце ў ёй, як дождж накропвае, затым набірае сілу, ператвараецца ў навальніцу з градам, потым

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

заціхае і зусім спыняецца. Заданне можа выконвацца вучнямі як на музычных інструментах, так і гучальнымі жэстамі. Напрыклад, могуць быць выкарыстаны розныя спосабы ўдараў па стале: далонямі, пальцамі, костачкамі пальцаў...

**С. 39:**

Паслухайце жартоўную вакальную п'есу "Каціны дуэт" (музыка Д. Расіні, К. Вейсе). Падзяліцеся сваімі ўражаннямі ад праслухоўвання. У чым заключаецца гукаперайманне? Як гучалі галасы катоў? Як вы думаеце, пра што яны маглі размаўляць?

→ Варта растлумачыць вучням значэнне слова "дуэт" — ансамбль з двух выканаўцаў.

Адлюструйце голасам размову трох розных катоў:

- маленькага, безабароннага кацяняці;
- вытанчанай кошкі;
- тлустага, лянівага ката.

Падумайце, які голас павінен быць у кожнага ката.

→ Выконваючы заданне, вучні імправізуюць голасам. Можна арганізаваць гульню "Каціны хор". Для гэтага клас дзеліцца на тры групы: у адной групе — кацяняты, у другой — кошкі, у трэцяй — лянівыя каты. Па жэсце настаўніка ўступае то адна, то другая група. У пэўны момант дырыжор дае сігнал — і ўвесь "хор" спявае адначасова.

**С. 40:**

Паслухайце і развучыце песню "У грыбы" (словы М. Алтухова, музыка У. Алоўнікава). Якая яна па характары? Колькі гукаў у песенькі зязюлі? Першы ці другі гук зязюлінай песенькі ("ку-ку") гучыць вышэй? Праспявайце песеньку зязюлі (сачыце за запісам у падручніку). Выканайце гэтыя гукі на металафоне, ксілафоне або фартэпіяна.

**С. 41:**

Пазнаёмцеся з музыкай французскага кампазітара Каміля Сен-Санса. Ён напісаў незвычайны твор, які атрымаў назву "Карнавал жывёл". Гэты твор складаецца з асобных частак. У кожнай частцы свая назва, і кожная прысвечана свайму персанажу. Адна з частак называецца "Куры і пеўні". Паслухайце гэты нумар. Паспрабуйце пачуць, якія інструменты ўдзельнічаюць у перадачы гукаў курэй і пеўняў.

→ У ходзе праслухоўвання вучні даведаюцца, што ў нумары "Куры і пеўні" ўдзельнічаюць кларнет, скрыпка, альт і фартэпіяна. У вучэбным дапаможніку дадзена адпаведная ілюстрацыя. Такім чынам, у вучняў ёсць магчымасць суаднесці гучанне музыкі з выявай інструментаў, а таксама убачыць, як іграюць на кожным з гэтых інструментаў.

**Урок 11**

***Святло і цень у музыцы (лад)***

**С. 42:**

Разгледзьце малюнкі. Як вы думаеце, у якіх птушак песня будзе гучаць весялей: у тых, што на волі, ці ў тых, што ў клетцы? Чым адрозніваюцца адзін ад аднаго малюнкі, размешчаныя ўнізе старонкі? Якому малюнку падыдзе музыка са светлымі фарбамі, а якому — з цёмнымі? Растлумачце свой адказ.

**С. 43:**

Праслухайце п'есу Дзмітрыя Кабалеўскага "Клоўны". Паназірайце, як хутка змяняюць адна адну светлыя і цёмныя фарбы ў гэтым творы.

Разгледзьце малюнкі хлопчыка і дзяўчынкі. Як вы думаеце, якую па настроі песню спявае хлопчык, а якую — дзяўчынка? Пра што яны могуць спяваць у гэтых песнях? Успомніце вясёлыя і сумныя песні, якія вы ведаеце. Выканайце іх.



**С. 44:**

Разгледзьце дзве карціны, прысвечаныя восені. Якая з карцін выглядае больш светла і святочна? Якая музыка ёй падыдзе? Паслухайце два музычныя фрагменты на тэму "Восень".

Які фрагмент, на ваш погляд, больш адпавядае першай карціне, а які — другой?

→ У якасці музычных фрагментаў вучням можна прапанаваць 1 і 2-ю часткі канцэрта "Восень" з цыкла "Поры года" А. Вівальдзі.

**С. 45:**

Паслухайце і развучыце беларускую народную песню "Пайшоў коўзацца каток". Святло або цемру ў музыцы вы адчулі? Выканаем песню з гучальнымі жэстамі. Для гэтага разгледзьце схему жэстаў да песні. Якія гучальныя жэсты вам спатрэбяцца? З якога жэста вы пачняце сваё гукавое суправаджэнне?

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

→ Аналізуючы схему жэстаў, вучні павінны адзначыць, што ім спатрэбяцца пстрычкі і воплескі. Пачынаецца акампанемент з пстрычкі, што адпавядае слабай долі (песня пачынаецца з-за такта).

Упрыгожце выкананне песні інструментальным суправаджэннем. Падбярыце для гэтага два інструменты: адзін будзе гучаць адначасова са пстрычкамі, другі — адначасова з воплескамі.

Паслухайце і развучыце беларускую народную песню "Чубаценькі верабей". Якіх фарбаў у гэтай песні больш: светлых або цёмных? Выканаем песню з гучальнымі жэстамі. Для гэтага разгледзьце схему. Якія гучальныя жэсты вам спатрэбяцца? З якога жэста вы пачняце сваё гукавое суправаджэнне (з плескача або воплеска)?

Упрыгожце выкананне песні інструментальным суправаджэннем. Падбярыце для гэтага два інструменты: адзін будзе гучаць адначасова з плескачамі, другі — адначасова з воплескамі.

### Урок 12

***Хуткае і павольнае ў музыцы (тэмп)***

**С. 46—47:**

Паслухайце два нумары з твора Каміля Сен-Санса "Карнавал жывёл". Першы твор — "Чарапахі", другі — "Антылопы". Як гучыць музыка ў кожным з нумароў? Які рух яна перадае? Разгледзьце малюнкі. Звярніце ўвагу на тое, якія інструменты ўдзельнічаюць у адлюстраванні чарапах, а якія — антылоп.



→ У ходзе праслухоўвання вучні даведваюцца, што нумар "Чарапахі" напісаны для струнных смычковых інструментаў (дзвюх скрыпак, альта, віяланчэлі, кантрабаса) і двух фартэпіяна. Нумар "Антылопы" выконваецца на двух фартэпіяна. У вучняў ёсць магчымасць суаднесці гучанне музыкі з ілюстрацыямі ў вучэбным дапаможніку.

Разгледзьце схемы. Паглядзіце, як размяшчаюцца на лінейках жоўтыя кружкі. Навучыцеся агучваць схему адначасова дзвюма рукамі. За кружкі на верхняй лінейцы "адказвае" правая рука, за кружкі на ніжняй лінейцы — левая. Можаце агучваць схему з дапамогай удараў падушачкамі пальцаў па стале альбо выкарыстоўваючы два алоўкі. Навучыцеся агучваць схему спачатку павольна, затым хутчэй і вельмі хутка. Да чарапахі ці антылопы падыходзіць гэтая схема?

Разгледзьце, як размяшчаюцца на лінейках фіялетавыя кружкі. Навучыцеся агучваць схему з удзелам правай і левай рук. За кружкі на верхняй лінейцы "адказвае" правая рука, за кружкі на ніжняй лінейцы — левая. Навучыцеся агучваць схему спачатку павольна, затым хутчэй і вельмі хутка. Якое выкананне схемы больш падыходзіць руху чарапахі, а якое скокам антылоп? Падумайце, рух якіх яшчэ жывёл можна перадаць такой ігрой. Прыдумайце і выканайце свае нумары.

**С. 48:**

Разгледзьце малюнкі. На якім з малюнкаў ціха ідзе снег, а на якім бушуе завіруха? Адлюструйце на музычных інструментах спачатку, як ціха падае снег, а потым, як бушуе завіруха.

**С. 49:**

Развучыце песню "Добры жук" (словы Я. Шварца, музыка А. Спадавекіа). Выканайце суправаджэнне да песні гучальнымі жэстамі (удар па парце — воплеск — удар па парце — воплеск). Падбярыце інструменты. Падзяліцеся на тры групы:

1-я група спявае і водзіць карагод;

2-я група спявае і акампануе гучальнымі жэстамі;

3-я група спявае і іграе на музычных інструментах.

### Урок 13

***Блізкае і далёкае ў музыцы (дынаміка)***

**С. 50:**

Разгледзьце малюнкі. Падумайце, якія гукі чуюцца больш выразна: тыя, што вымаўляе хлопчык, размешчаны бліжэй да нас, або тыя, што вымаўляе хлопчык, які знаходзіцца ўдалечыні? Вымавіце кліч "Агу!" тры разы: гучна, ціха, вельмі ціха.

Агучым схему. Паглядзіце, як размяшчаюцца кружкі на лінейках. Якая рука павінна ўключыцца ў ігру першай? Па колькі разоў павінны выконвацца гукі кожнай рукой?

Агучым схему з рознай гучнасцю. Прыдумайце сітуацыю, у якой гукі спачатку ледзь чутныя, потым паступова становяцца больш гучнымі, затым зноў становяцца цішэйшыя і "знікаюць" удалечыні. Якая назва падышла б да вашага твора? Паспрабуйце агучыць задуманае на музычным інструменце.

**С. 51:**

Паслухайце твор Уладзіслава Агафоннікава "Сані са званочкамі". Звярніце ўвагу, як будзе

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

гучаць музыка ў пачатку твора і ў канцы. Дапоўніце паўторнае слуханне музыкі ігрой на музычных інструментах.

**С. 52:**

Разгледзьце малюнак. Што на ім перададзена? Паспрабуйце самастойна адлюстраваць завею (завыванне завірухі). Для гэтага на гук [у] пакажыце, як завіруха пачынае ціха кружыцца, як набірае сілу, а затым паступова сціхае. Дапоўніце гучанне завеі (завірухі) кругавымі рухамі рук перад сабой.

**С. 53:**

Разгледзьце малюнкі. Якая па гучнасці музыка падышла б да кожнага малюнка? Растлумачце свой адказ.

Як у музыцы можна было б перадаць змест малюнкаў з гномікамі? Звярніце ўвагу на тое, у якім кірунку гномікі рухаюцца, ці лёгка ім ісці.

→ Аналізуючы змест двух ніжніх малюнкаў, вучні павінны заўважыць, што на першым малюнку гномікі набліжаюцца да нас, пры гэтым яны нясуць вельмі цяжкае бервяно — значыць, музыка будзе гучаць павольна і з паступовым узмацненнем гучнасці. На другім малюнку гномікі ідуць без рэчаў па бервяне, аддаляючыся ад нас, — значыць, музыка будзе лёгкай і рухавай, пры гэтым сіла гуку будзе паступова слабець.

### Урок 14

***Халодная і цёплая музыка (тэмбр)***

**С. 54:**

Назавіце музычныя інструменты, адлюстраваныя на малюнку. Паслухайце, як яны гучаць. Вызначце, у якіх інструментаў голас "халодны", а ў якіх "цёплы".

Развучыце песню "Здагадайся, хто пяе" (словы А. Гангава, музыка А. Цілічэевай). Выканайце песню як гульню.

**С. 55:**

Разгледзьце музычныя інструменты ў верхняй і ніжняй рамках. Што ў іх агульнае і чым яны адрозніваюцца? Паслухайце гучанне звычайных інструментаў і іх электрычных "сваякоў". У якіх інструментаў, на ваш погляд, голас больш "цёплы"?

**С. 56:**

Разгледзьце малюнкі. Якому малюнку падыдзе музыка, выкананая "цёплымі" галасамі, а якому — "халоднымі"? Растлумачце свой адказ.

**С. 57:**

Праслухайце "Вальс сняжынак", напісаны Пятром Чайкоўскім для музычнага спектакля "Шчаўкунок". Хто акрамя аркестра ўдзельнічае ў выкананні вальса?

→ У склад інструментаў, якія выконваюць вальс, уваходзяць флейта, флейта-пікала, кларнет, фагот, габой, англійскі ражок, валторна, трамбон, труба, туба, скрыпка, альт, віяланчэль, кантрабас, званочкі, трохвугольнік, літаўры, талеркі, бас-кларнет. З большасцю гэтых інструментаў першакласнікі яшчэ не знаёмыя, аднак дзеці абавязкова адзначаць разнастайнасць галасоў, вылучаць голас арфы і трохвугольніка, скрыпак і флейты. Таксама вучні вызначаць на слых гучанне жаночага (дзіцячага) хору. У сваім адзінстве гэтыя галасы малююць карціну зімовага чароўнага лесу, ствараюць адчуванне свята.

### Урок 15

***Высокія і нізкія гукі (рэгістр)***

**С. 58:**

Разгледзьце малюнкі. Прыдумайце размову любой пары герояў. У каго з герояў голас будзе гучаць высока, а ў каго нізка? Агучце размову герояў на склад *лё*.

Разгледзьце схему. Як размяшчаюцца кружкі на лінейках? Які голас (высокі ці нізкі) пачынае? Агучце схему на металафоне або ксілафоне.



**С. 59:**

Разгледзьце малюнак. "Ідучы" пальчыкам па прыступках, спявайце на склад *лё*. Чым вышэй вы будзеце падымацца па прыступках, тым вышэйшы павінен быць гук. Праспявайце чатыры разы склад *лё*, знаходзячыся на верхняй прыступцы. "Рухаючыся" па прыступках уніз, спявайце з паніжэннем гуку.

Разгледзьце схему. Як размешчаны кружкі? Колькі разоў паўтараецца кружок на верхняй лінейцы? Агучце схему галасам або на металафоне.

→ Знаёмячы вучняў з гукавышынным бокам мелодыі, настаўнік можа выкарыстаць прыём пластычнага інтанавання: спачатку праспяваць гукі, паказваючы змяненне вышыні рукой, затым выканаць гукі, "крочачы" пальчыкам па прыступках.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**С. 60:**

Разгледзьце званочкі. Як вы лічыце, у якога званочка будзе самы высокі голас, а ў якога самы нізкі?

→ Пры наяўнасці ў класе званочкаў розных памераў адказ на гэтае пытанне вучні знаходзяць эксперыментальным шляхам: звоняць у кожны званочак і параўноўваюць вышыню іх гучання. Пры адсутнасці ў класе такіх званочкаў настаўнік паведамляе: чым большы інструмент, тым ніжэйшы яго голас. Таму самы высокі голас будзе ў маленькага званочка, самы нізкі — у вялікага. Можна ўспомніць скрыпку і кантрабас і правесці адпаведную аналогію.

Разгледзьце схемы, якія адлюстроўваюць гучанне званочкаў. Агучце іх голасам.

Разгледзьце інструменты ў рамцы. Блакітным колерам на іх пазначаны нізкія гукі, жоўтым — высокія. Пакажыце на гітары струны з больш нізкім гучаннем. Пакажыце на баяне кнопкі, якія "адказваюць" за больш высокае гучанне. Пакажыце на клавішным інструменце спачатку тыя клавішы, якія выдаюць самыя высокія гукі, а затым самыя нізкія.

**С. 61:**

Паслухайце п'есу Роберта Шумана "Дзед Мароз". Якімі гукамі (высокімі, сярэднімі або нізкімі) намаляваў Дзеда Мароза кампазітар? Як вы думаеце, чаму кампазітар выкарыстаў менавіта такія гукі? Што вам намалявала музыка сярэдняй часткі п'есы?

Уважліва разгледзьце схему. Звярніце ўвагу на тое, што высокія і нізкія гукі выконваюцца то па чарзе, то адначасова. Патрэніруйцеся агучваць схему спачатку палачкамі (алоўкамі) па стале. Калі гэта ў вас будзе добра атрымлівацца, выканайце заданне на ксілафоне, металафоне або фартэпіяна.

### Урок 16

### *Абагульняючы ўрок па тэме "Як расказвае музыка?"*

**С. 62:**

Паслухайце п'есу беларускага кампазітара Кіма Цесакова "Гульня ў снежкі". Якую карціну малюе музыка? Які настрой перадае? Раскажыце, як гучала музыка: павольна або хутка, ціха або гучна, на розных гуках або часта гучаў адзін і той жа гук?

**С. 63:**

Калі б вы былі кампазітарамі, якую музыку вы стварылі б да першага малюнка, а якую — да другога? Як вы назвалі б свае творы?

Паслухайце два музычныя творы. Вызначце, якія з іх падыходзіць да першага малюнка, а які — да другога. Растлумачце, як музыка дапамагла вам знайсці правільны адказ.

→ Вучням для праслухоўвання прапануюцца фартэпіянныя п'есы: "Калыханка" беларускага кампазітара Рыгора Суруса і "Пятрушка" нямецкага кампазітара Іаганэса Брамса. Важна, каб у працэсе агучвання адказу дзеці яго аргументавалі, абапіраючыся на асаблівасці музыкальнай мовы (характар музыкі, яе хуткасць, вышыню гучання, сілу гуку).

Разгледзьце схему. Для выканання на якім інструменце яна прызначана? Звярніце ўвагу, якія два спосабы гульні на бубне пазначаны ў схеме. Агучце схему на бубне або гучальнымі жэстамі.

→ Увага першакласнікаў звяртаецца на тое, што на бубне можна іграць, стукаючы то далонню, то аднымі падушачкамі пальцаў. У выпадку адсутнасці ў класе інструментаў заданне выконваецца гучальнымі жэстамі: воплескам, ударам падушачак пальцаў правай рукі па левай далоні.



**С. 64–65:**

Выканаем песню пра Новы год. Падбярыце да песні выразныя танцавальныя рухі. Выкарыстайце пры выкананні гучальныя жэсты.

→ Вучні спяваюць адну з навагодніх песень: "Здравствуй, зимушка-зима" (словы Т. Волгінай, музыка А. Філіпенкі), "Навагодняя хараводная" (словы Ю. Ляднёва, музыка А. Астроўскага) альбо "Навагодняя" (словы А. Навуменкі, музыка В. Каваліва).

**В. В. КАВАЛІЎ,**
дацэнт кафедры педагогікі і псіхалогіі пачатковай адукацыі БДПУ імя М. Танка;
**М. Б. ГАРБУНОВА,**
метадыст вышэйшай катэгорыі аддзела метадычнага забеспячэння пачатковай адукацыі НІА.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ